**24.** Кароткае іншасказальнае апісанне якога-небудзь прадмета, з’явы, якія трэба пазнаць, адгадаць, называецца … .

**А)** прымаўка. **Б)** прыказка. **В)** загадка. **Г)** фразеалагізм. **Д)** казка.

---

**25.** З дадзеных слоў выберыце тыя, што маюць толькі корань і канчатак.

*1) горад; 2) сталіца; 3) лётчык; 4) пасадка.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**26.** Дадзены сказ: *Летам дзеці ўжо накупаюцца ў рэчцы* ***колькі ўлезе.***

Якім членам сказа з’яўляецца выдзеленае ўстойлівае спалучэнне?

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** дапаўненнем.

**Г)** азначэннем. **Д)** акалічнасцю.

---

**27.** Дадзены літаратурныя паняцці:

*а) эпітэт; б) метафара; в) увасабленне.*

Суаднясіце паняцці і іх значэнні: *1) перанясенне ўласцівасцей адной з’явы на другую, чым-небудзь падобную на яе;*

*2) мастацкі прыём, калі нежывым ці неадушаўлёным прадметам і з’явам надаюцца ўласцівасці чалавека або жывых істот;*

*3) мастацкае азначэнне, якое вобразна (жыва, наглядна, паэтычна) характарызуе прадмет, з’яву, чалавека.*

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-2, б-3, в-1. **В)** а-2, б-1, в-3. **Г)** а-3, б-2, в-1. **Д)** а-3, б-1, в-2.

---

**28.** Якое слова прапушчана ў народных выслоўях?

*1) Не лезе ні ў якія … . 2) … пірагамі падпёрты.*

*3) Добраму госцю … самі адчыняюцца.*

**А)** сцены. **Б)** дзверы. **В)** вокны. **Г)** вароты. **Д)** каморы.

---

**29.** Вызначце правільна напісаныя зборныя лічэбнікі ў форме творнага склону.

*1) абодвума; 2) абодзвума; 3) абедзвюма; 4) абедзвума.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**30.** Вучні атрымалі заданне прадоўжыць народныя прыкметы па пачатку: *а) Мокры май – …; б) Зоркі высыпалі ў ноч на Купалу – …;*

*в) Сакавік з вадой – … .*

Дапамажыце падабраць працяг:

*1) многа грыбоў будзе; 2) жыта як гай; 3) красавік з травой.*

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-2, б-3, в-1. **В)** а-2, б-1, в-3. **Г)** а-3, б-2, в-1. **Д)** а-3, б-1, в-2.

---


Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Інтэлектуальныя спаборніцтвы «Конкурс»
КОНКУРС


220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/


Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 4. Тыраж 19300 экз. Мінск. 2025 г.


# Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры
# «БУСЛІК-2025»

*Чацвер, 13 лютага 2025 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 5-6 класаў

**1.** Колькі слоў у скорагаворцы?

*Трыццацьтрыбагатырысабралісяўбары.*

**А)** 4. **Б)** 5. **В)** 6. **Г)** 7. **Д)** 8.

---

**2.** Якія словы маюць адзін склад?

*1) агляд; 2) край; 3) бок; 4) хата.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**3.** “Калі ласка, даруйце!” – гавораць, калі … .

**А)** сустрэнуць сябра. **Б)** заходзяць у свой пакой. **В)** просяць прабачэння.

**Г)** развітваюцца. **Д)** дзякуюць.

---

**4.** Вызначце, які сказ па мэце выказвання.

*Ой, рэчанька, рэчанька,*
*Чаму ж ты няпоўная?*

**А)** клічны. **Б)** няклічны. **В)** пытальны. **Г)** апавядальны. **Д)** сцвярджальны.

---

**5.** Адгадайце загадку.

*Ні рук, ні ног не мае, а яблыкі страсае.*

**А)** гром. **Б)** вецер. **В)** холад. **Г)** птушка. **Д)** маланка.

**6.** Што называецца *“вопраткай”* ствала дрэва?

**А)** расколіна. **Б)** кара. **В)** лісце. **Г)** галлё. **Д)** гнёзды.

---

**7.** Выберыце з прапанаваных прыкладаў дыялектныя словы.

*1) настоўнік; 2) картопля; 3) смаката; 4) мяшок.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**8.** Дадзены сказы:

*1. У пакоі новая мэбля канапа, камода, кніжная шафа.*

*2. Лугі, палі, выганы – усё было заліта вадой у канцы сакавіка.*

*3. Усё абуджала цудоўны настрой: сонца, яснае неба, шчабятанне птушак.*

У якім сказе няправільна пастаўлены знакі прыпынку?

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такога сказа. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

---

**9.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску напішаце прыстаўны зычны ***в***?

*1) ..узел; 2) ..окны; 3) ..осень; 4) ..угал.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**10.** Колькі дзеясловаў у вершаваных радках з твора Якуба Коласа?

*Лядок закашляў, заіскрыўся,* *Ляцяць крупінкі ледзяныя,*
*На срэбра-друзачкі пабіўся;* *Бы ўлетку пырскі дажджавыя…*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**11.** Вызначце правільна напісаныя словы.

*1) коляр; 2) сувязь; 3) пояс; 4) балярына.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**12.** У народзе гавораць, што гэта насякомае “спявае” крыламі, а “слухае” нагамі. Хто гэта?

**А)** вусень. **Б)** цвыркун. **В)** матыль. **Г)** жук. **Д)** мурашка.

---

**13.** У якіх словах з прапанаваных ёсць **[л’]**?

*1) сталь; 2) стол; 3) лён; 4) святло.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** у 1, 2. **В)** у 1, 3. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 2, 4.

---

**14.** Як правільна напісаць па-беларуску адпаведнік рускага слова *крошить*?

**А)** крашыць. **Б)** крышыць. **В)** крашыть. **Г)** крышыть. **Д)** крэшыць.

---

**15.** Дадзены сказ: *На ўсходзе пачало падымацца* ***сонца****.*

Якім членам сказа з’яўляецца выдзеленае слова?

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** дапаўненнем.
**Г)** азначэннем. **Д)** акалічнасцю.

---

**16.** Вызначце словы з нулявым канчаткам.

*1) зазвінець; 2) зацемна; 3) урок; 4) радасць.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**17.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску напішаце літару **е**?

*1) с..р’ёзны; 2) св..тлы; 3) цв..рды; 4) тал..нт.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**18.** Вызначце з прапанаваных слова, у сярэдзіне якога адбываецца аглушэнне зычнага перад наступным зычным.

*1) лыжка; 2) лыжня; 3) мышка.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такога слова. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**19.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце змякчальны мяккі знак (**ь**)?

*1) раз..ба; 2) барэл..еф; 3) дзец..мі; 4) галл..ё.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**20.** Вызначце з прапанаваных словы, у якіх можна пераставіць літары і атрымаюцца новыя словы.

*1) сіла; 2) мара; 3) мэта.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**21.** Словы *весела – радасна* з’яўляюцца … .

**А)** сінонімамі. **Б)** антонімамі. **В)** паронімамі. **Г)** амонімамі. **Д)** амафонамі.

---

**22.** Вызначце з прапанаваных сказы са звароткам.

*1. Мой родны кут, ты найпрыгажэйшы ў свеце!*

*2. Беражыце, дзеці, прыроду, яна наша багацце.*

*3. Родныя краявіды, блакітнае неба, яркае сонца – усё знайшло адлюстраванне на карціне.*

**А)** усе сказы. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**23.** Якія з прапанаваных назоўнікі ў форме адзіночнага ліку роднага склону маюць канчатак ***-у(-ю)***?

*1) рубель; 2) алфавіт; 3) спакой; 4) перапіс.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма такіх назоўнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.